УДК 821.161.3.09-84

# Метафара як лінгвістычны сродак уздзеяння ў беларускай рэвалюцыйнай публіцыстыцы 19 стагоддзя (на матэрыяле “Мужыцкай праўды”)

Сідарэнка Ю.Ю.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

На працягу доўгага часу філосафы, публіцысты і пісьменнікі адзначалі існаванне моўных механізмаў уздзеяння на свядомасць. З дапамогай аналізу тэкстаў газет, журналаў, радыёперадач быў вызначаны прыкладны пералік моўных сродкаў, якія выкарыстоўваюцца з мэтай аказаць пэўнае ўздзеянне на рэцыпіента. Сукупнасць моўных сродкаў даволі сталая і ўключае: пэўны пласт лексікі (эмацыянальна-ацэначныя словы, жарганізмы, тэрміны), тропы (параўнанне, метафара, метанімія) і набор фігур сінтаксісу (сінтаксічны паралелізм, антытэза, рытарычнае пытанне).

Яскравым прыкладам беларускай рэвалюцыйнай публіцыстыкі 19 стагоддзя з’яўляецца газета “Мужыцкая праўда” (далей – МР), якая мела сваёй мэтай звярнуць на сябе ўвагу простага народа, данесці праўду пра тагачасную грамадска-палітычную сітуацыю, даць адказы на самыя вострыя сацыяльна-эканамічныя пытанні, схіліць мужыка да пэўных дзеянняў (канкрэтна – да ўдзелу ў паўстанні).

Адным з моўных сродкаў ўздзеяння на свядомасць у МР з’яўляецца метафара. Менавіта дзякуючы ёй рэалізуюцца такія асаблівасці стылю МР як даступнасць, агульназразумеласць і вобразнасць. Так, у першым нумары МР сустракаецца некалькі метафар са словам *prauda*: *pisaci praudu* (***pisaci** takuju **praudu** sprawiedliwu jak Boh na niebi* [МР, 1]*), zahremić nasza prauda* і *prauda pierelecić (O, **zahremić nasza prauda** i jak małanka **pierelecić** pa świeci!* [МР, 1]*), uczyć swajej mużyckoj praudy (my możem ... jeszcze i **uczyć swajej mużyckoj praudy*** [МР, 1]*)*. У трэцім нумары газеты сустракаюцца метафары *jon [rąd] nas abdziraje i hłumić (... kożny wiedaje szto **jon nas abdziraje i hłumić**...* [МР, 3]*) i tumanić rozum: kab nie mahli **tumanić rozumu** waszaho* [МР, 3]. Метафара *[tauczy] mużyckoju rukoju* набліжае нас да жыцця простага мужыка: *... to chtoby jon nie byu, czy to Starszyna, czy Akrużny, czy choć sam Gubernator, to wy **joho tauczycie mużyckoju rukoju**...* [МР, 5] У шостым нумары МР аўтар твора малюе яркі вобраз таго, што здарыцца з чалавекам, які адрокся ад сваёй веры і ад Бога, і выкарыстоўвае для гэтага метафару *rwaci duszu na kuski: Addaść u Piekło na wiecznyje męki, buduć czerty **duszu naszu na kuski rwaci*** ... [МР, 6].

Такім чынам, метафарызуюцца ў творы абстрактныя і некаторыя грамадска-палітычныя паняцці, гэта значыць менавіта тыя, якія патрабуюць дадатковага тлумачэння для мужыцкага асяроддзя.